# Даведнік

# **Мясцовыя праблемы: моладзевы погляд**

Горкі 2005

Даведнік. Мясцовыя праблемы: моладзевы погляд.

Даведнік змяшчае інфармацыю па методыцы вызначэння праблемаў на лакальным узроўні і пошуках іх вырашэння. Аснову выдання складаюць вынікі даследавання, праведзенага сярод моладзі Горак Магілёўскай вобласці.

Выказваем падзяку

супрацоўнікам установы “Агенцтва рэгіянальнага развіцця і міжрэгіянальнага супрацоўніцтва” Віталю Макаранку і Зміцеру Салаўёву за падрыхтоўку тэарэтычнай часткі.

Па ўсіх пытаннях і прапановах звяртацца на e-mail: horki@studenty.by

©
Калектыў аўтараў
Распаўсюджваецца бясплатна
Горкі 2005

Змест

Уступ
Мясцовыя праблемы: тэарэтычныя асновы

Што такое праблема?
Метады вызначэння праблемаў на лакальным узроўні
Вырашэнне праблемаў: план кампаніі
Магчымасці вырашэння мясцовых праблемаў у беларускіх умовах
Прыклады вырашэння мясцовых праблемаў. Сусветны досвед

Мясцовыя праблемы Горак: вынікі апытання

Вырашэнне праблемаў: свежыя ідэі

# Уступ

Жыццё не абходзіцца без праблемаў. Кім бы ты ні быў, дзе б ні жыў, чым бы ні займаўся – заўжды цябе будуць атачаць праблемы. Яны ў кожнага розныя і кожны па-свойму да іх ставіцца. Усіх аб’ядноўвае толькі адно – жаданне зменшыць колькасць праблемаў. Можна сказаць, што вялікую частку часу чалавек выдаткоўвае на пошук шляхоў вырашэнне розных складаных сітуацыяў. Гэты даведнік – спроба мясцовых грамадскіх актывістаў эфектыўна выкарыстаць час на вызначэнне і вырашэнне праблемаў Горак.

Даведнік задумваўся, з аднаго боку, як спроба артыкуляцыі лакальных праблемаў у розных сферах жыццядзейнасці мясцовых жыхароў (у пераважнай большасці маладых людзей), а з другога боку, як спроба прапанаваць цікавыя ідэі, што вітаюць у маладых галовах, па вырашэнні гэтых праблемаў. Ніякіх аўтарскіх правоў на прапанаваныя ў даведніку ідэі не існуе, бо твор стаўся вынікам калектыўнай працы і прызначаны для шырокага грамадскага ўжытку.

У сваю чаргу тыя, хто мае свой погляд на Горацкія праблемы і магчымасці іх вырашэння, знойдуць у даведніку багата тэарэтычнага матэрыялу, які дапаможа ў правільнай ідэнтыфікацыі мясцовых праблемаў, вызначэнні іх прычынаў і наступстваў, розных спосабаў іх вырашэння. Адмысловы раздзел тэарэтычнай часткі прысвечаны тым магчымасцям вырашэння мясцовых праблемаў, якія дае сённяшняе беларускае заканадаўства. Апрача гэтага чытачам прапанавана некалькі цікавых прыкладаў вырашэння праблемаў на лакальным узроўні ва Украіне, Славакіі і Венгрыі.

Аўтары спадзяюцца, што даведнік будзе карысным у працы мясцоваму Савету дэпутатаў, журналістам, прадстаўнікам гарадской адміністрацыі, а таксама шырокаму колу чытачоў.

# Мясцовыя праблемы: тэарэтычныя асновы

## Што такое праблема?

Калі весці гаворку пра вызначэнне паняцця «праблема», дык неабходна сказаць наступнае: амаль кожны чалавек разумее пад «праблемай» нешта такое, што перашкаджае нармальнаму жыццю. Калі перашкода датычыць вялікай колькасці людзей, можна гаварыць пра існаванне сацыяльнай праблемы.

Кожны з нас мае ўяўленне аб тым, як «павінна быць» у той ці іншай сферы. Гэта значыць, існуе нейкі ідэальны вобраз, «бачанне» таго, як павінна быць у нейкай сітуацыі. Адхіленне ад нармальнага, жаданага стану і ёсць праблемай. А яе вырашэннем будзе прывядзенне сітуацыі да нармальнага ці жаданага становішча. Калі ўявіць, што ідэальны стан – гэта белы, чысты аркуш паперы, дык праблему можна выявіць ў выглядзе нейкай плямы на гэтым аркушы, а вырашэнне праблемы можна выразіць у працэсе сцірання гэтай плямы.

Праблемы ўзнікаюць, у шырокім сэнсе, з-за недасканаласці грамадства, з-за недасканаласці людзей і стасункаў між імі. Няма ідэальных грамадстваў, як няма ідэальных людзей, у сацыяльным плане ідэальнае амаль немагчыма. Таму наяўнасці альбо ўзнікнення праблемаў няма чаго палохацца. Але не дапускаць іх, не ствараць іх, вучыцца пазбягаць – таксама важная задача як грамадскіх дзеячоў, так і грамадства ў цэлым.

Праблемы бываюць рознымі ў залежнасці ад: сферы жыццядзейнасці, у каторай яны ўзнікаюць (сацыяльныя, эканамічныя, палітычныя, экалагічныя); маштабаў (глабальныя, міжнародныя, рэгіянальныя, прыватныя); складанасці (вырашальныя, невырашальныя).

Перад тым, як пачаць працу над вырашэннем праблемы, трэба адказаць на некалькі пытанняў. А ці ёсць праблема? Ці з’яўляецца тое, што мы лічым праблемай, ёю насамрэч. Ці гэта сімптом, праяўленне іншай праблемы? Напрыклад, мы можам казаць аб існаванні праблемы «п’янства сярод моладзі». І спрабаваць яе вырашыць на ўзроўні Горак. Тады трэба прааналізаваць сітуацыю ў такім плане: п’янства – гэта праблема ці ўсё ж сімптом нейкай больш шырокай праблемы, напрыклад, сацыяльнай неўпарадкаванасці моладзі ці высокага ўзроўню беспрацоўя. Чыя гэта праблема? Гэта значыць і тое, хто цярпіць ад існавання праблемы, і тое, што (хто) з’яўляецца прычынай узнікнення і існавання праблемы. Што будзе, калі праблему не вырашаць, і як сітуацыя павінна выглядаць, калі праблема, па нашым меркаванні, будзе вырашана? Якім чынам, па якіх крытэрах мы зможам лічыць, што праблема вырашана? Якімі інструментамі мы будзем карыстацца для вырашэння праблемы і наколькі яны прымальныя з прававога і маральнага пункту гледжання? Напрыклад, ці павялічэнне міліцэйскіх патрулёў у месцах збору моладзі прывядзе да зніжэння ўзроўню спажывання алкаголю, ці гэта зменшыць толькі знешнія сімптомы – менш п’яных маладзёнаў будзе бадзяцца па вуліцы, але яны будуць піць у іншых месцах.

Добра характарызуе адрозненне сімптому ад праблемы просты побытавы прыклад. У вас баліць зуб (ці жывот), і вы лічыце гэта праблемай. Каб суняць боль, вы п’яце анальгін. Ці можна лічыць праблему вырашанай? Боль (зубны ці іншы) – гэта сімптом хваробы, і «вырашаючы праблемы» такім чынам, вы толькі знішчаеце сімптомы, і нараджаеце новыя праблемы. Трэба зразумець прычыну ўзнікнення праблемы і змагацца з ёй.

## Метады вызначэння праблемаў на лакальным узроўні

Для вызначэння праблемаў існуе шэраг як навуковых, гэтак і простых шляхоў. Прывядзем некалькі найбольш распаўсюджаных метадаў (гл. табліцу 1).

Найбольш папулярнай і цікавай з’яўляецца тэхніка «мазгавога штурму». Таму выкладзем пару парадаў для яе ажыццяўлення. Прапанаваная тэхніка станецца эфектыўнай, калі вам патрэбна сабраць неабходную інфармацыю па праблеме і перайсці да наступнага кроку - пошуку шляхоў вырашэння праблемы.

**Табліца 1.**

***Асноўныя метады вызначэння праблемаў***

| Сродак | Тлумачэнне | Кантэкст |
|---|---|---|
| **Апытанне жыхароў** | Складаюцца пісьмовыя апытанні. | Ад дзвярэй да дзвярэй, па пошце. |
| **Дзённікі часу** | Актывісты запісваюць праблемы, якія ў іх узнікаюць на працягу дня на працы, у двары, краме, на вуліцы, у транспарце. | Асабістыя запсы ў дзённіку часу. |
| **Круглыя сталы, дыскусіі** | Праводзяцца круглыя сталы і дыскусіі па мясцовых праблемах. | У “фокус-групах”, на грамадскіх канферэнцыях. |
| **“Мазгавы штурм”** | Грамадзяне ці эксперты выказваюць свае думкі ў вольным да абмежаванняў асяродку. | У “фокус-групах”, на грамадскіх канферэнцыях. |
| **Аналіз праблем “галасаваннем”** | Асобы выдзяляюць прыярытэтныя праблемы і візуальна “галасуюць” за іх. | У “фокус-групах”, на грамадскіх канферэнцыях. |
| **Аналіз прэсы і тэлебачання** | Прамблемныя тэмы адсочваюцца праз прэсу, асабліва праз лісты грамадзянаў. | Мясоцвая прэса, тэлебачанне. |
| **Сайт у Інтэрнэце** | Неафіцыйныя сайты, форумы гораду, праз якія можна выкласці свае думкі па лакальных праблемах. | Інтэрнэт. |
| **Актыўныя абмеркаванні** | Вычарпальны аналіз сітуацыі з выкарыстаннем досведу асобаў. | У “фокус-групах”. |

Вось некалькі карысных парадаў «Мазгавога штурму»:

- Адкладзіце ацэнку
- Падчас штурму прымаюцца ўсе ідэі без іх абмеркавання.
- Вітайце «вольны палёт»
- Адпусціце «тармазы» свайго мозгу, і хай ідэі паплывуць патокам.
- Імкніцеся да колькасці

- Чым больш ідэяў, тым большая верагоднасць таго, што вы знойдзеце карысныя магчымасці.
- Камбінуйце і паляпшайце
- Выслухайце ідэі кожнага і падумайце, ці зможаце вы іх развіць. Некаторыя з ідэяў могуць падштурхнуць вашы творчыя падыходы і інтуіцыю.
- Не «рэдагуйце» ідэі
- Ідэі не абмяркоўваюцца, не папраўляюцца і не ацэньваюцца, а проста хутка выказваюцца і запісваюцца.

Калі вы з дапамогай «мазгавога штурму» вызначылі дзесяткі, а то і сотні праблемаў, вам трэба выдзеліць найбольш значныя праблемы. Для гэтага вам больш падыдзе метад «Аналіз праблем галасаваннем», у якім кожны з удзельнікаў «мазгавога штурму» галасуе за дзве праблемы са спісу, які быў атрыманы. Рэйтынгам вызначаецца найбольш значная праблема (ці некалькі важных праблемаў).

# Вырашэнне праблемаў: план кампаніі

Этапы стварэння плану грамадскай кампаніі па вырашэнні праблемаў наступныя: (далей прыведзены рэкамендацыі з досведу паспяховых кампаніяў па ўсім свеце, дзе паказаныя асноўныя крокі ў планаванні).

*А) Падбор групы людзей, з якімі будзе праводзіцца кампанія.*

Размова ідзе пра невялікую групу натхнёных людзей, якія будуць праводзіць і кіраваць акцыяй. Аб'ядноўваць іх павінна агульная мэта і жаданне нешта зрабіць для агульнай справы. Неабходна памятаць пра падбор людзей, які дазволіць разглядаць праблему з розных пазіцый. Поспех акцыі залежыць ад узроўню грамадскай і палітычнай дасведчанасці і кампетэнцыі гэтых асобаў. Яны павінны добра ведаць тэхналогіі функцыянавання ўлады, заканадаўчага працэсу і работы з грамадскай думкай. Неабходна дамовіцца пра:

- месца кантактаў, сакратарыят,
- невялікую, мабільную Раду, што можа аператыўна прымаць рашэнні,
- стасункі з СМІ і каналамі знешняй камунікацыі з грамадствам, стварэнне прывабнага іміджу кампаніі,
- спосабы ўнутранай камунікацыі, прыняцце рашэнняў,
- прыблізнае размеркаванне заданняў паміж удзельнікамі групы, зыходзячы са здольнасцяў і магчымасцяў гэтых кожнага.

*Б) Вызначэнне праблемы і пастаноўка мэтаў кампаніі.*

Пра тое, як правільна ідэнтыфікаваць праблему, не зблытаць яе з сімптомамі, было апісана раней. Пастаноўка мэтаў кампаніі робіцца наступным чынам. Мэтай кампаніі будзе вырашэнне вызначанай праблемы, прывядзенне сітуацыі да «ідэальнага» з вашага пункту гледжання стану. Правільнае фармуляванне мэты – адзін з ключавых момантаў планавання кампаніі. Мэта павінна:

- адлюстроўваць канкрэтны шлях вырашэння праблемы,
- лагічна выцякаць з пастаноўкі праблемы,
- дасягацца крок за крокам,
- быць у прынцыпе дасягальнай, а вынікі паддавацца вымярэнню.

Іншымі словамі, добра сфармуляваная мэта павінна адпавядаць крытэрам SMART – быць канкрэтнай (specific), вымяральнай (measurable), дасягальнай (achievable), рэалістычнай (realistic), вызначанай у часе (time-bound).

*В) Збор сапраўдных звестак.*

Вельмі важна арыентавацца на правераныя звесткі. Трэба вызначыць, што прывяло да ўзнікнення праблемы. Неабходна вызначыць, на якім узроўні прымаюцца рашэнні па гэтай праблеме (мясцовыя дзяржорганы, самакіраванне, урад краіны, парламент, міністэрствы, ведамствы, іншыя ўстановы і г.д.)

Збор інфармацыі павінен адбывацца сістэматычна. Лепш за ўсё пачаць з даследавання арганізацыяў і ўстановаў, што займаюцца «вашай спецыфікай». Гэта могуць быць розныя дзяржаўныя, навукова-даследчыя ўстановы, школы і ВНУ, спецыялізаваныя СМІ і няўрадавыя грамадскія арганізацыі. Могуць дапамагчы і крыніцы з Інтэрнэту. Вельмі часта аказваецца, што здабытая на гэтым этапе інфармацыя для паспяховай стратэгіі будзе на вагу золата.

*Г) Распрацоўка стратэгіі.*

Непасрэдныя распрацоўшчыкі стратэгіі грамадскай акцыі павінны адказаць на 3 пытанні: дзе мы?, як адсюль ісці?, куды мы хочам прыйсці? Пры адказе на гэтыя пытанні мы атрымаем: 1) аналіз сітуацыі, 2) план непасрэдных дзеянняў, 3) канчатковую мэту нашай кампаніі. А ўвогуле, стратэгічнае планаванне дзейнасці можна выявіць у выглядзе спіралі ПЛАН–РЭЛІЗАЦЫЯ–АЦЭНКА, дзе этапы ідуць адзін за адным у выглядзе спіралі, што падымаецца ўгару.

Для паспяховага планавання дзейнасці неабходна правільна вызначыць: рэсурсы для вырашэння праблемы, саюзнікаў, якія вам дапамогуць праблему вырашыць, супраціўнікаў, якія вам будуць заўжды перашкаджаць, а таксама тых, хто непасрэдна прымае патрэбныя вам рашэнні (мішэні).

Рэсурсы бываюць наступных відаў:

- Чалавечыя
- Матэрыяльна-тэхнічныя
- Інфармацыйныя
- Інтэлектуальныя
- Фінансавыя
- Рэсурс часу

Некаторыя ўдзельнікі грамадскіх акцый выдзяляюць яшчэ і рэсурс «сувязяў», то бок магчымасці, якія можна выкарыстоўваць, маючы знаёмствы з «патрэбнымі» людзьмі.

З вышэйзгаданых відаў рэсурсаў самым галоўным з’яўляецца рэсурс часу, бо яго немагчыма павялічыць ці ўзнавіць. Астатнія віды рэсурсаў могуць быць кампенсаваць ці, пры пэўных агаворках, замяняць адзін аднаго. Так, калі ў вас маецца вялікі доступ да матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў, фінансаў ды інфармацыі, вам могуць спатрэбіцца ўсяго 2-3 чалавекі для дасягнення пастаўленых мэтаў. І наадварот, калі вы знайшлі вялікую колькасць тых, хто разам з вамі гатовы працаваць на вырашэнне пэўнай праблемы, гэта можа лёгка кампенсаваць недахоп сродкаў і іншых магчымасцяў.

Неабходна ведаць, якія рэсурсы ёсць для вырашэння праблемы, якіх не хапае, крыніцы рэсурсаў, якіх не хапае (дзе іх можна ўзяць).

Пры аналізе саюзнікаў трэба дакладна вызначыць хто, якія групы грамадства ці асобы з’яўляюцца вашымі саюзнікамі і чым канкрэтна яны могуць вам дапамагчы. Тое ж самае трэба зрабіць і ў адносінах да супраціўнікаў і зразумець, хто і якім чынам можа вам перашкаджаць, а таксама, якім чынам можна нейтралізаваць негатыўны ўплыў супраціўнікаў і павялічыць пазітыўны ўплыў саюзнікаў.

Наступны крок – гэта вызначэнне «мішэняў», то бок тых асобаў, што непасрэдна могуць уплываць на вырашэнне той ці іншай праблемы. Існуюць 2 віды «мішэняў»: простыя (прамыя) і ўскосныя. Простыя – гэта тыя, хто маюць непасрэднае дачыненне да праблемы (міністр, старшыня выканкаму, дэкан і г.д.) Ускосныя – тыя, хто маюць свой уплыў на простыя «мішэні» (жонкі, сваякі, сябры, вышэйшыя кіраўнікі і г.д.). Правёўшы аналіз «мішэняў», вы адкажаце на пытанні: хто мае ўладу, каб вырашыць тое, чаго вы дамагаецеся? Што трэба зрабіць, каб паўплываць на гэтых людзей? Хто мае ўплыў на тых, хто прымае рашэнні? Як магчыма ўплываць на ўскосныя «мішэні»? Што канкрэтна можна зрабіць, каб паўплываць на гэтых людзей?

Потым неабходна выпрацаваць самі метады вашай дзейнасці ў кампаніі і скласці працоўны план. Метады – гэта тая непасрэдная дзейнасць, якую вы будзеце праводзіць у межах кампаніі. Вы ўжо ведаеце ШТО трэба дасягнуць, застаецца

адказаць на пытанне ЯК вы гэтага будзеце дасягаць. Працоўны план апісвае тыя віды дзейнасці, якія неабходна зрабіць для атрымання жаданых вынікаў з дапамогай наяўных ці запланаваных рэсурсаў.

У працоўным плане неабходна паказаць:

- Што будзе зроблена,
- Хто будзе ажыццяўляць тыя ці іншыя дзеянні,
- Як яны будуць ажыццяўляцца,
- Дзе яны будуць праводзіцца,
- Калі гэта павінна быць зроблена,
- У якой паслядоўнасці,
- Якія рэсурсы будуць прыцягнутыя.

Лепш за ўсё афармляць працоўны план у выглядзе табліцы, якую заўсёды патрэбна трымаць на відавоку. Гэта дапаможа вам у арганізацыі як удзельнікаў працоўнага штабу кампаніі, так і групаў валанцёраў, падвысіць адказнасць і выканаўчую дысцыпліну (гл. табліцу 2).

Можна выдзеліць некалькі асноўных метадаў, што ўжываюцца пры правядзенні рознага кшталту грамадскіх акцыях.

Метады работы з насельніцтвам:

- Улёткі,
- Рассылка лістоў,
- Петыцыі,
- Публічныя выступы,
- Масавыя мерапрыемствы (пікеты, мітынгі, шэсці, хэпінінгі, флэш-мобы і г.д.).

Метады лабіравання інтарэсаў:

- Асабістыя сустрэчы з прадстаўнікамі органаў кіравання, кандыдатамі ў дэпутаты/прэзідэнты, дзейнымі дэпутатамі,
- Пісьмовыя звароты да кандыдатаў у дэпутаты/прэзідэнты, да дзейных дэпутатаў,
- Перамовы па тэлефоне.

**Табліца 2.**

***Працоўны план кампаніі***

| Дзеянні | Час (па тыднях) | | | | | | Адказны | Месца | Рэсурсы |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Паседжанні штабу** | X | | X | | | X | Васіль | Інтэрнат | памяшканне |
| **Аб'явы ў прэсе** | | X | | | | | Кася | Рэдакцыя газеты | 5000 руб. |
| **Выраб улётак** | | X | X | | | | Лявон | Магілёўская друкарня | Папера, грошы на праезд, дастаўка = 20000 руб. |
| **Падача заявы на дазвол канцэрту** | | | | X | X | | Васіль | Равыканкам | Папера |
| **Прэс-канфэрэнцыя** | | | | | | X | Кася | Кавярня | Папера+30000 руб. на кавярню |
| **Канцэрт** | | | | | | X | Лявон | У залі (на паветры) | Людзі |

Метады работы са СМІ:

- Рассылка прэс-рэлізаў,
- Артыкулы,
- Лісты ў рэдакцыю,
- Арганізацыя дыскусій у прэсе,
- Інтэрв'ю,
- Удзел у тэматычных перадачах.

Увогуле, існуе шмат метадаў дасягнення сваіх мэтаў негвалтоўным шляхам. У падручніку прафесара Дж.Шарпа іх 198. Пры дастатковым жаданні і вынаходніцтве можна распрацаваць свае ўнікальныя і дзейсныя.

*Д) Стварэнне кааліцыяў*

На арэне грамадскай дзейнасці поспех у асноўным залежыць ад таго, якая падтрымка будзе аказана нашым высілкам (нашай працы, укладзеным рэсурсам, выдаткаванаму часу). Саюзнікам можа стаць кожны, хто пажадае, каму не абыякавае рашэнне дадзенай праблемы. Пошук саюзнікаў і прыхільнікаў мае вялікі ўплыў на поспех акцыі абароны грамадскіх інтарэсаў.

Самым галоўным повадам для стварэння кааліцыяў у вырашэнні праблемаў з'яўляецца павелічэнне сілы і дзеяздольнасці ў дасягненні мэтаў. Кааліцыі прапануюць форму для сумеснага абмеркавання праблемаў, камбінуюць фінансавыя, матэрыяльныя рэсурсы і чалавечы патэнцыял, прыцягваюць увагу СМІ і людзей, што ўплываюць на прыняцце рашэнняў, умацоўваюць салідарнасць і карпаратыўнасць, ствараюць імідж і сур'ёзнасць у вачах грамадскасці.

Моц кааліцыі заключаецца ў колькасці, разнастайнасці яе складальнікаў.

*Е) Аналіз кампаніі*

Апошнюю кропку ў акцыі вырашэння грамадскіх праблемаў робіць аналіз, які дазваляе ўдзельнікам ацаніць ходу акцыі і вынікі прыкладзеных высілкаў. Аналіз мае вялікае значэнне як прыклад для іншых актывістаў і дапамагае праводзіць наступныя акцыі больш дасканала.

Асноўнае кола пытанняў, якія трэба прымаць да ўвагі пры падрыхтоўцы да акцыі:

- Хто ці якія групы з'яўляюцца ініцыятарамі акцыі?
- Калі ўзнікла ініцыятыва правядзення акцыі? Яна завершаная ці яшчэ працягваецца?
- Якая яе мэта ці чаканні?
- Якая сітуацыя ці патрэбы прымусілі асобныя групы пачаць актыўныя дзеянні?
- Хто быў ключавымі фігурамі?
- Хто быў адказным за прыняцце рашэнняў, якія былі механізмы прыняцця рашэнняў?
- Да каго найперш была адрасавана ініцыятыва?
- Якія віды дзейнасці былі найбольш важнымі?
- Якіх вынікаў дасягнулі, якім чынам былі вызначаныя крытэры паспяховасці?
- Якія будуць наступныя крокі, калі яны будуць рэалізаваныя?
- Якія былі перашкоды ў дзейнасці?
- Чаму вы навучыліся падчас правядзення кампаніі? Што можна абагульніць? Што б вы зрабілі па-іншаму? Што можна скарыстаць у іншых відах дзейнасці?
- Ці захаваныя ўзоры матэрыялаў, звязаных з дзейнасцю (брашуры, рэклама, выданні, артыкулы), дзе яны знаходзяцца?

# Магчымасці вырашэння мясцовых праблемаў у беларускіх умовах

Беларускія ўмовы накладаюць пэўны спецыфічны адбітак на магчымасць выкарыстання тых ці іншых метадаў дзейнасці па вырашэнні грамадскіх супярэчнасцяў.

Правядзенне масавых акцыяў у нашай краіне рэгламентуецца Законам «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь». Рэаліі такія, што мясцовыя ўлады вызначаюць месцы правядзення масавых акцый дзе-небудзь на ўскрайку горада, там, дзе амаль няма людзей, што робіць саму масавую акцыю мала сэнсоўнай. Але пагроза правядзення акцый сама па сабе можа мець выключны эфект. Напрыклад, жыхары аднаго дома ў Магілёве, дзе доўгі час не працаваў ліфт, а ўлады не вырашалі гэтага пытання, падалі заяўку на пікетаванне раённай адміністрацыі. На наступны дзень ліфт быў адрамантаваны.

Перашкодай для правядзення акцыі можа стаць патрабаванне ўладамі аплаты паслугаў па «ахове парадку і медыцынскай дапамогі» падчас акцыяў. У гэтым выпадку трэба вырашаць – ці гатовыя вы плаціць грошы за правядзенне запланаванай акцыі. Часцяком для ўздзеяння на людзей значна важнейшае за саму акцыю яе асвятленне ў СМІ ці праз адмысловыя друкаваныя матэрыялы.

Выраб і распаўсюд друкаваных матэрыялаў рэгламентуецца Законам «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». Ён накладае абмежаванні, напрыклад, на наклад гэтых выданняў. Такім чынам, улётка, якую вы выпускаеце, павінна мець тое, што ў законе вызначана як «выходныя звесткі», то бок мусіць быць пазначана месца друку, звесткі пра адказнага за выпуск, наклад (тыраж), які не можа быць большым за 299 асобнікаў (пры большым накладзе вы мусіце звярнуцца ў Міністэрства інфармацыі па рэгістрацыю вашых друкаваных матэрыялаў).

## Улёткі.

***Мэта ўлёткі*** – праінфармаваць людзей пра нешта ці падштурхнуць іх нешта зрабіць. Адзін від улётак – для раздачы ці іншага распаўсюду. Іншы – для расклейкі. Улёткі, што добра выглядаюць і лёгка чытаюцца, дапамогуць вам данесці ідэі ці інфармацыю да сотняў людзей. Пры вырабе ўлётак прытрымлівайцеся наступных правілаў:

- Выкарыстоўвайце просты, лёгкачытэльны шрыфт.
- Каляровая ўлётка прыцягвае значна большаю ўвагу, але выкарыстоўвайце не больш за 3-4 колеры.
- Просты і яркі загаловак, які адразу дае зразумець пра што ідзе гаворка – гарантыя таго, што ўвага будзе прыцягнутая і да зместу ўлёткі, і яна не паляціць у сметніцу адразу.
- Змест улётак мусіць быць простым і зразумелым для ўсіх катэгорыяў грамадзян. Ён мусіць захопліваць іх увагу з першага радку. Пазбягайце мудрагелістых, спецыфічных выразаў і складаназалежных сказаў.
- Калі вы імкняцеся пабудзіць людзей прыняць удзел у нейкім мерапрыемстве, скажыце канкрэтна, што ім трэба зрабіць, куды і калі трэба прыходзіць.
- Людзі не будуць чытаць доўгія тэксты, будзьце лаканічнымі.
- Эмацыйнасць мусіць прысутнічаць, але без істэрычнасці.

- Пажадана выкарыстоўваць фота ці малюнкі. Пад імі мусіць быць абавязковы каментар.
- Укажыце хто вы (назоў ініцыятывы, групы, арганізацыі), ваш адрас і нумар тэлефону, электронную пошту, сайт.
- Улётка мусіць мець кідкі лозунг, заклік, слоган. Пажадана, каб ён знаходзіўся напрыканцы.

Калі вы рыхтуеце ўлётку для расклейкі, прадумайце, дзе, на якіх месцах яна будзе клеіцца. Гэта патрэбна, каб зрабіць форму і фармат зручнымі, напрыклад, для расклейкі на слупы. Тэксту на такой улётцы не павінны быць болей за 7-8 сказаў. Шрыфт адпаведна павялічаны, чытэльны здалёк. Паверхня, дзе будзе наклееная ўлётка, мусіць быць перпендыкулярнай да руху людзей. Калі ёсць магчымасць, абавязкова зрабіце асноўны лозунг іншым колерам. Ён павінен займаць 1/4 – 1/5 паверхні ўлёткі. Найбольш заўважныя спалучэнні колераў: чорны і жоўты, белы і чырвоны.

***Пры раздачы ўлётак неабходна:***

- валодаць інфармацыяй пра праблему, якую вы вырашаеце, пра вашу арганізацыю (ініцыятыву),
- памятаць змест улёткі,
- быць гатовым да пытанняў,
- быць гатовым да неадэкватных паводзінаў некаторых асобаў, не паддавацца на правакацыі,
- слухаць каментары і вылучаць з іх добрыя ідэі,
- занатоўваць кантактную інфармацыю пра зацікаўленых – так вы зможаце пашырыць кола партнёраў,
- не пакідаць пасля сабе смецця.

## Выкарыстанне «Кнігі заўваг і прапановаў»

Зараз у кожнай установе, на кожным прадпрыемстве, у кожнага прадпрымальніка ёсць ***«Кніга заўваг і прапановаў».*** Яны былі ўведзеныя дэкрэтам прэзідэнта РБ №2 ад 14.01.2005. На кожны запіс у такой кнізе яе ўладальнік павінен рэагаваць. Кнігу вельмі ўважліва правяраюць розныя кантрольныя органы, таму ваш запіс адносна нейкай праблемы (неабавязкова скарга) хутчэй за ўсё не будзе пакінуты без увагі. Кніга павінна давацца вам па першым патрабаванні. Не можа быць апраўданнем нявыдачы кнігі «адсутнасць адказнай асобы» ці «ключа ад сейфу». На сёння гэта даволі моцны інструмент уплыву на розныя ўстановы ці органы ўлады пры вырашэнні праблемаў.

## Тэлефанаванні афіцыйным асобам (па ўстановах):

- Падрыхтуйцеся да тэлефанавання, занатуйце, каму вы хочаце тэлефанаваць і што вы хочаце вырашыць,
- Выбірайце зручны час – гэта ранак або час адразу пасля абеду,
- Складзіце спіс пытанняў. Падчас размовы адзначайце, пра што ўжо запыталіся, каб не паўтарацца,
- Напачатку павітайцеся, прадстаўцеся і паведаміце, з якой нагоды вы тэлефануеце,
- Звяртайцеся ветліва, з выкарыстаннем імя ды імя па бацьку,
- Фармулюйце думкі проста і коратка,
- Рабіце запісы,

- Калі вы не зразумелі сэнс сказанага, папрасіце паўтарыць ці патлумачыць,
- Ні ў якім разе не злуйцеся і не грубіце,
- Перад заканчэннем размовы ўпэўніцеся, што вы ўсё зразумелі, а таксама зразумелі вас,
- Падзякуйце за размову і дапамогу.

## Лісты афіцыйным асобам.

Дакладна сфармулюйце мэту ліста перад тым, як яго напісаць. Пры напісанні афіцыйных лістоў звычайна прытрымліваюцца стандартнай формы:

1. У правым верхнім куце пазначаецца назоў установы, пасада, імя, імя па бацьку чалавека, да якога вы звяртаецеся
2. Зварот: Паважаны Ігнат Ігнатавіч! Затым паведаміце: хто вы (прадстаўцеся асабіста ці ўкажыце назву арганізацыі, ініцыятывы, ад імя якой вы звяртаецеся), дакладна і выразна сфармулюйце праблему, якую вы вырашаеце і чаму. Выкладзіце сваю просьбу ці прапанову. Пішыце каротка. Людзі, якія чытаюць шмат дакументаў, як правіла, маюць мала часу. Калі вашу работу падтрымліваюць нейкія «ўплывовыя» людзі, пакажыце гэта ў сваім лісце (такое робіць уражанне). Тэкст набірайце на кампутары ці друкарскай машынцы. Ён павінен лёгка чытацца. Абавязкова праверце ліст, бо памылкі адцягваюць увагу і падрываюць давер.
3. Напрыканцы ліста пастаўце дату з левага боку, а з правага - звесткі пра кантактную асобу, паміж імі – подпіс. Правільна падпісвайце канверт. Напішыце зваротны адрас. Зрабіце копію ліста і захавайце яе.

## Петыцыі.

Гэта, фактычна, ***лісты з вялікай колькасцю подпісаў.*** Іх выкарыстоўваюць для адсылкі службовым асобам, каб пераканаць у важнасці праблемы. Збор подпісаў пад петыцыямі не рэгламентаваны заканадаўствам, таму самому гэтаму працэсу ніхто не ў праве перашкаджаць. Разгляд петыцыяў адбываецца згодна з Законам «Аб зваротах грамадзянаў» не больш за месяц. На жаль, часцяком міліцыянеры альбо іншыя службовыя асобы спрабуюць перашкодзіць збору подпісаў, заяўляючы, што для гэтага трэба рэгістраваць ініцыятыўную групу ці браць нейкі «дазвол». Памятайце, што гэта не так.

- Для эфектыўнасці збору подпісаў дайце вашай петыцыі яскравы, просты і кароткі загаловак.
- Пішыце петыцыю як невялікі ліст. Коратка апішыце праблему і тое, што вы збіраецеся рабіць ці робіце для яе вырашэння.
- Пакіньце месца для подпісаў.
- Зрабіце вашу ідэю зразумелай, каб падпісаць тое, пра што вы гаворыце, было лёгка.
- Уключайце інфармацыю пра арганізатараў гэтай акцыі.

Падчас збору подпісаў:

- Распавядзіце людзям пра вашу праблему і планы па яе вырашэнні. Карыстайцеся простай, зразумелай мовай. Людзі захочуць ведаць болей, перад тым як паставяць подпіс – будзьце падрыхтаваны да пытанняў.
- Будзьце ветлівымі і цярплівымі.
- Дайце людзям зрабіць свой выбар. Магчыма, нехта не захоча падпісвацца – гэта яго права.
- Рабіце першыя подпісы самі або дайце падпісаць сябрам, знаёмым. Людзі лягчэй падпісваюцца, калі некалькі подпісаў ужо ёсць.

- Зрабіце копію петыцыі перад падачай.
- Петыцыю можна адаслаць у СМІ або іншым чынам прэзентаваць грамадскасці.

## Інфармацыйныя кампаніі.

Нягледзячы на спецыфіку беларускай сітуацыі, СМІ застаюцца адным з самых уплывовых чыннікаў, што могуць прывесці да жаданага выніку.

- Вызначце мэты, якія б вы хацелі дасягнуць праз інфармацыйную кампанію (змена пункту гледжання, адносінаў да праблемы, адкрытая дыскусія), а таксама мэтавую групу, да якой вы звяртаецеся.
- Прыдумайце галоўную ідэю кампаніі, зварот, лозунг, зразумелы дэвіз.
- Падрыхтуйце каляндар ці план падзеяў, што павінны ўзгадвацца ў прэсе.
- Вызначце медыяльныя магчымасці і выступы. Якога маштабу павінна быць кампанія, з дапамогай якіх СМІ вы звернецеся да вашых мэтавых групаў? Якая структура і даступнасць асобных СМІ, наколькі яны папулярныя і наколькі ім давяраюць? Якія крыніцы (чалавечыя, матэрыяльныя, фінансавыя, кантактавыя) знаходзяцца ў вашым распараджэнні?
- Знайдзіце словы і аргументы, вызначце тэму. Свае думкі і дзейнасць прэзентуйце для грамадскасці прывабным чынам. Падрыхтуйце ключавыя словы, запасіцеся аргументамі. Самым важным вынікам вашых высілкаў павінна быць акрамя зразумелага плану падрыхтоўка простага і зразумелага паведамлення (паслання), міні-місіі, якая б тычылася канкрэтнай кампаніі, дзейнасці ці ідэі.

Непасрэдна метады працы са СМІ наступныя: прэсавая канферэнцыя, брыфінг, тэлефонныя размовы з прадстаўнікамі СМІ, падрыхтоўка матэрыялаў для прэсы, паведамленні ў прэсе, інтэрв’ю і ўдзел у тэматычных перадачах.

***Для дэталёвай распрацоўкі стратэгіі інфармацыйнай кампаніі трэба адказаць на наступныя пытанні:***

- Якія мэты вашай інфармацыйнай кампаніі?
- Якія яе межы па часе?
- Да якой мэтавай групы вы звяртаецеся?
- Якое ваша пасланне?
- Якія аргументы і ключавыя словы вы выбіраеце?
- Якімі на ваш погляд павінны быць загалоўкі?
- Якія артыкулы вы хацелі б прачытаць пра сваю дзейнасць?
- Якія формы працы з СМІ вы хочаце выкарыстаць?
- На які час разлічана кампанія?

# Прыклады вырашэння мясцовых праблемаў. Сусветны досвед

Агульным прынцыпам, па якім мясцовыя супольнасці імкнуцца вырашаць свае праблемы за мяжой, з'яўляецца прынцып міжсектарнага супрацоўніцтва. Гэта значыць, што праблемы вырашаюцца ва ўзаемадзеянні ўладаў, бізнесу і разнастайных грамадскіх некамерцыйных арганізацыяў ды ініцыятываў. Наяўнасць свабоднай прэсы, выбарнасць кіраўнікоў мясцовай улады, значныя правы мясцовых органаў самакіравання – усё гэта палягчае працу мясцовага актыву ў сферы вырашэння праблемаў. Але асноўныя падыходы могуць паспяхова выкарыстоўвацца і ў нашай сітуацыі.

## Славакія: актыўнае выслухоўванне

Гэта адзін са спосабаў даследавання грамадскіх настрояў. Ён заахвочвае камунікацыю між жыхарамі пэўнага населенага пункту. Мясцовыя актывісты – «слухачы» – наведваюць сваіх суграмадзян на даму і даведваюцца пра тое, што тым падабаецца, а што – не, і што хацелася б змяніць.

У Славакіі гэтая праца вядзецца з 1997 году ў 28 населеных пунктах. За гэты час было выслухана каля 4700 грамадзян. Досвед паказвае, што праз «выслухоўванне» людзі становяцца часткай грамадскага дзеяння ў сваёй супольнасці. «Слухачы» пабачылі, што жыхары дакладна разумеюць, што неабходна для іх населенага пункту, а некаторыя нават гатовыя дапамагчы ў вырашэнні канкрэтных праблемаў. Звесткі, сабраныя «слухачамі», часта аказваюць уплыў на прынятыя мясцовымі ўладамі рашэнні, дапамагаюць у стварэнні планаў развіцця населеных пунктаў, спрыяюць некамерцыйным арганізацыям у пошуку новых саюзнікаў і новых сфераў дзейнасці.

Пасля заканчэння этапу «выслухоўвання» яго вынікі друкуюцца ў мясцовай прэсе і гэткім чынам усе жыхары знаёмяцца з думкамі сваіх суседзяў. Гэтая праца вучыць выслухоўваць грамадзян, мяняе стаўленне да іх думкі з боку ўладаў, дазваляе ўцягваць людзей у працэс вырашэння мясцовых праблемаў.

Некаторыя «слухачы» на падставе свайго досведу гэткай працы вылучаюцца кандыдатамі на выбарах у органы мясцовага самакіравання.

## Спынілі абвал балконаў

Звычайны мікрараён у Нітрах (Славакія) пабудаваны болей за 20 гадоў таму: бязлікія абшарпаныя шматпавярховікі, разбітыя дарогі, неахайныя пад'езды, адсутнасць дзіцячых пляцовак. Жыхарам раёну не падабаецца тут жыць. Пры гэтым яны мяркуюць, што самі нічога не могуць зрабіць, каб палепшыць умовы свайго існавання.

Прадстаўнік грамадскай арганізацыі «Грамадзяне ў дзеянні» пачаў хадзіць па кватэрах, каб даведацца пра набалелыя праблемы раёну. Потым разам з групай актыўных грамадзянаў ён выбраў са шматлікіх названых праблемаў адну, асабліва вострую і зручную для таго, каб арганізаваць кампанію. Гэтая праблема была ў тым, што пастаянна з балконаў некаторых «высотак» адвальваліся кавалкі бетону. Яны пагражалі жыццям і мінакоў (прахожых) і жыхароў. Мінулыя намаганні вырашыць гэтую праблему далі толькі тое, што мясцовыя «камунальнікі» абнеслі плотам небяспечныя дамы. Зразумела, што праблема такім спосабам не была развязаная.

Пасля патрабавання мясцовай камунальнай канторы менш выкарыстоўваць балконы з-за небяспекі абвалу іх частак, арганізатар пачаў праводзіць агітацыйныя размовы з жыхарамі састарэлых дамоў. У выніку на працягу некалькіх дзён сфармавалася група лідэраў з 10 чалавек, якія разам распрацавалі план кампаніі.

Першы этап кампаніі складаўся з хуткага збору подпісаў усіх зацікаўленых жыхароў пад петыцыяй, што патрабавала ад дырэктару камунальнай гаспадаркі тэрміновай экспертызы і ўдакладнення даты санацыі балконаў. На перадачу петыцыі групай грамадзянаў былі запрошаныя прадстаўнікі мясцовых СМІ, якіх лідэры пазнаёмілі са сваёй пазіцыяй і абвясцілі пра пачатак кампаніі.

Пасля група лідэраў з арганізатарам пачала рыхтаваць адкрыты сход, на які быў запрошаны дырэктар камунальнай канторы. Тэрмін правядзення сходу – апошні дзень, калі па законе мусіў быць атрыманы адказ на петыцыю. Тым часам, пад ціскам крытычных выступаў мясцовай газеты, мэрыя гораду звольніла дырэктара «камунальнікаў» з пасады. Паколькі адказ на петыцыю не задаволіў чаканні жыхароў, на наступны сход сабралася каля 100 грамадзянаў, якія дамагліся ад сакратара мясцовай камунальнай канторы абяцання да пэўнага тэрміну правесці экспертызу і папрасіць у мэрыі датацыі на санацыю балконаў. Гэты частковы поспех не спыніў актыўнасці жыхароў.

Кульмінацыяй кампаніі стала акцыя 25 актывістаў на сустрэчы з муніцыпальным праўленнем, якое павінна было выдзеліць сродкі на рамонт балконаў. Актывісты прынеслі на паседжанне кавалкі бетону, што адваліўся ад балконаў, і раздалі іх дэпутатам. Мясцоваму Савету нічога не заставалася, як толькі выдзеліць 3 мільёны славацкіх крон (каля 100 тысяч даляраў) на санацыю балконаў.

Такім чынам, кампанія завяршылася поспехам. Жыхары зразумелі, што арганізаванымі высілкамі можна сапраўды вырашыць праблемы сваёй супольнасці. Да ініцыятыўнай групы грамадзянаў ды арганізацыі «Грамадзяне ў дзеянні» пачалі ставіцца з павагай і жыхары і кіраўніцтва гораду. Зараз у рэгіёне вядзецца праца па далейшым паляпшэнні стану камунальнай гаспадаркі.

## Зменшылі злачыннасць

У адным з раёнаў славацкага горада Баньска Быстрыца найбольшай праблемай была злачыннасць. За выпраўленне становішча ўзяліся мясцовыя актыўныя грамадзяне. Спачатку яны проста сабраліся, абмеркавалі сітуацыю і вырашылі ісці да кіраўніка гарадской паліцыі.

Першым урокам было тое, што калі грамадзяне наведвалі галоўнага ахоўніка парадку па адным, дык той ставіўся да «хадакоў» абыякава, а то і груба. Наступным разам да паліцэйскага пайшло адразу чатыры актывісты. Як і чакалася, кіраўнік паліцыі праявіў больш павагі і паставіўся да словаў дэлегатаў сур’ёзна.

Каб весці прадметную гутарку, група актывістаў даследавала праблему злачыннасці больш дасканала і прыйшла да высновы: неабходна павялічыць колькасць ахоўнікаў парадку, якія патрулююць дадзены раён горада Баньска Быстрыца. Актыўныя грамадзяне даведаліся, што нягледзячы на тое, што ў раёне жыве траціна насельнікаў горада, тут працуе толькі 10% ад усіх паліцэйскіх. Большасць жа патрульных працавала на цэнтральных вуліцах Баньскай Быстрыцы.

Актывісты вырашылі, што трэба дамагацца, каб 12 з 56 гарадскіх паліцэйскіх патрулявалі небяспечны раён. Было вырашана пачаць збор подпісаў, каб атрымаць падтрымку грамадзянаў і паўплываць на кіраўніка паліцыі. Дадаткова гараджане звярнуліся ў мясцовы Савет дэпутатаў, а дакладней у дэпутацкую камісію, якая

займалася пытаннямі правапарадку. Дэпутаты пагадзіліся падтрымаць жыхароў небяспечнага раёну і таксама звярнуліся да кіраўніка паліцыі і мэра.

Апошнім крокам групы было рашэнне зладзіць сустрэчу кіраўніка гарадской паліцыі з жыхарамі праблемнага раёну. На сустрэчу было вырашана сабраць не меней за 100 чалавек. Даведаўшыся пра гэта, галоўны ахоўнік парадку сам патэлефанаваў актывістам і папрасіў пра асобную сустрэчу. Актывісты пагадзіліся і выслухалі аргументы паліцыі, якія тлумачылі, што ніяк не могуць выканаць просьбу гараджанаў. Аднак людзі настойвалі на сваім і прыводзілі прыклады разгулу злачыннасці. Праз некалькі гадзінаў гутаркі начальнік паліцыі пагадзіўся павяліць колькасць патрульных да 10.

На гэтую перамогу сышло тры месяцы працы.

## Венгрыя: пазбавіцца ад беспрацоўя

Барч – невялікі венгерскі горад на мяжы з Харватыяй. Для грамадзянаў гэтай мясцовасці найбольшай праблемай было беспрацоўе. Найменш занятай часткай насельніцтва былі цыгане. За развязанне праблемы ўзялася мясцовая няўрадавая арганізацыя «Партнёры Венгрыі». Яна вырашыла, што прасцей з праблемай будзе справіцца праз пашырэнне інфармацыі пра сітуацыю, прыцягненне ўладаў і прадстаўнікоў цыганскай меншыні да выпрацоўкі шляхоў выхаду са становішча.

Азначаныя бакі найперш мусілі даследаваць праблему. Пасля некалькіх сустрэчаў, у якіх прынялі ўдзел мэр горада, прадстаўнікі яго адміністрацыі, кіраўнікі цыганскай нацыянальнай меншыні, мясцовых фірм, упраўлення па працы, школ, было вырашана распрацаваць праграму па змяншэнніі беспрацоўя.

Першым крокам удзельнікі сустрэчаў вызначылі прычыны беспрацоўя: недастатковая адукацыя; прычыны, звязаныя з асобай беспрацоўнага; прычыны, звязаныя з працадаўцам і іншае.

Далей удзельнікі грамадскага дыялогу распрацавалі ва ўсіх сферах задачы, якія неабходна было вырашыць, устанавілі адказных – канкрэтныя асобы і арганізацыі. Усе прапанаваныя праграмы патрабавалі дадатковага грамадскага дыялогу: дзякуючы супрацы прадстаўнікоў цыганскай меншыні і ўпраўлення па працы была выпрацаваная комплексная адукацыйная праграма; у двух пачатковых школах арганізавалі курсы для асабліва адораных дзяцей, а таксама для дзяцей з фізічнымі ці разумовымі недахопамі; кіраўніцтва дзіцячага садку і школ далучылася да праграмы аказання дапамогі цыганскім дзецям, якія апынуліся ў складанай сітуацыі; праз мясцовае тэлебачанне пачалася рэклама пазітыўных мадэляў паводзінаў і прыкладаў у праграме «Цыганскі часопіс»; праз праграму пасадкі маладога лесу і далейшага яго дагляду было створана 109 дадатковых рабочых месцаў.

У дадатак такая кааперацыя дазволіла пераадолець негатыўнае стаўленне розных нацыяў, якія насяляюць Барч, адна да адной.

## Украіна: размеркаванне адмянілі студэнты

Як і ў нас, ва Украіне вырашылі паправіць закон «Аб вышэйшай адукацыі». Паводле новай рэдакцыі закону студэнтаў збіраліся размяркоўваць аж на тры гады.

Пасля таго як 22 верасня 2005 году Вярхоўная Рада Украіны падрыхтавала праект новага закону «Аб вышэйшай адукацыі» студэнцкія няўрадавыя арганізацыі звярнуліся да прэзідэнта Віктара Юшчанкі, каб той не падпісваў закон у прапанаваным выглядзе. Пасля гэтага звароту найбуйнейшая арганізацыя Украіны «Студэнцкае брацтва» высунула пяць патрабаванняў да Міністэрства адукацыі, галоўнымі з якіх былі: скасаванне трохгадовага размеркавання, адмена аплаты

студэнтамі пераздачаў іспытаў, увядзенне ільготаў на праезд у летнія месяцы, адстаўка рэктараў, якія парушалі правы ўкраінскіх студэнтаў падчас «аранжавай рэвалюцыі».

Аднак міністр адукацыі Станіслаў Нікалаенка не адразу пайшоў на саступкі. Ён сустрэўся з лідэрамі «Студэнцкага брацтва» і падпісаў афіцыйныя лісты рэктарам і кіраўнікам ВНУ пра незаконнасць спагнання са студэнтаў грошай за пераздачу іспытаў.

У адказ на няпоўнасцю выкананыя патрабаванні агульнанацыянальныя студэнцкія арганізацыі Украіны стварылі Каардынацыйную раду студэнцкіх арганізацыяў, якая абвясціла пра пачатак кампаніі па абароне студэнцкіх правоў.

Кампанія пачалася з пікетаў і абвяшчэння галадоўкі. Студэнты выйшлі да будынкаў Кабінета міністраў і Міністэрства адукацыі. Актывісты заклікалі дэпутатаў і чыноўнікаў распачаць грамадскія слуханні па студэнцкіх праблемах, але ўлады былі заняты сваімі справамі і праігнаравалі заклікі мітынгоўцаў. У гэты момант здалося, што моладзь не зможа перамагчы. Але студэнты не здаваліся: яны працягвалі вулічныя акцыі і гублялі прытомнасць ад галадовак. Пра студэнцкія праблемы пачалі пісаць газеты, тэлебачанне рабіла сюжэт за сюжэтам, інтэрнэт-форумы раздзіралі абмеркаванні складанага становішча. Такая ўвага грамадства і відавочнасць для ўкраінцаў абсурду новага закону пераламілі сітуацыю.

Пра перамогу стала зразумела меней чым праз месяц – 17 кастрычніка, калі Міністр адукацыі Станіслаў Нікалаенка звярнуўся да прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі з прапановаю накласці вета на ўнясенне зменаў у закон «Аб вышэйшай адукацыі» і пагадзіўся з тым, што ўвядзенне размеркавання з’яўляецца неадназначным. Праз некалькі дзён міністр пайшоў далей і пагадзіўся з усімі патрабаваннямі студэнтаў.

# Мясцовыя праблемы Горак: вынікі апытання

Адным з метадаў вызначэння актуальных мясцовых праблемаў, а таксама пошуку іх вырашэння з'яўляецца сацыялагічнае апытанне. Яно ў ідэале дазваляе атрымаць такі аб'ём інфармацыі, якога дастаткова, каб меркаваць пра погляды мясцовай супольнасці адносна мэтаў апытання.

У нашым выпадку для даследавання думкі моладзі адносна існых у рэгіёне праблемаў было праведзенае анкетнае апытанне, арыентаванае на атрыманне інфармацыі для непасрэднага карыстання. Выбаркай анкетавання сталася 1002 чалавекі з Горацкага рэгіёну, якія самастойна запаўнялі прапанаваныя ім анкеты **(Табліца 3).**

Рэспандэнтамі ў асноўным сталі школьнікі, студэнты, а таксама, так званая, працоўная моладзь (у гэтую групу адносіліся не толькі тыя маладыя людзі, якія сапраўды ходзяць на працу, але і тыя, хто не трапляў пад першую і другую групы апытаных). Гэтым людзям было прапанавана адказаць на пытанні адносна мясцовых праблемаў, якія існуюць у самім горадзе, акадэміі як самастойнай частцы рэгіёну, а таксама ў межах пражывання рэспандэнтаў.

Акрамя вызначэння праблемаў рэспандэнтам было прапанавана выкласці свой погляд на вырашэнне ўказаных імі праблемаў.

У першым і другім выпадку удзельнікам апытання даводзілася адказваць на паўзакрытыя пытанні, якія акрамя прапанаванага шэрагу варыянтаў адказу дапушчалі мажлівасць уласных прапановаў.

Акрамя гэтага адной з крыніцаў інфармацыі пры апытанні былі каментары рэспандэнтаў, якія яны давалі падчас запаўнення анкет. Дзякуючы такім каментарам, былі атрыманыя дадатковыя звесткі, якія дазволілі патлумачыць, якой рацыяй карысталіся апытаныя, калі выбіралі той ці іншы з прапанаваных варыянтаў адказу.

## Праблемы горада

Першы блок апытальніка быў прысвечаны праблемам, якія найчасцей сустракаюцца ў горадзе **(Малюнак 1)**. Болей за палову апытаных мяркуюць, што найбольшай праблемай для Горак з'яўляецца недахоп месцаў адпачынку. Такое меркаванне, на наш погляд, вынікае з дэмаграфічнага становішча горада, у якім, паводле розных падлікаў, каля 40% насельнікаў - маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў. Паводле меркавання апытаных, найменш іх турбуе праца гарадскога транспарту, якая ў апошнія год-два радыкальна пераўтварылася. Гэта адбылося ў асноўным дзякуючы эфектыўнай працы маршрутак, а таксама таксі ды іншых прыватных перавозчыкаў.

Іншая сітуацыя склалася з міжгароднімі перавозкамі. Крыху больш за 20% апытаных не задаволеныя міжгародняй транспартнай сеткай, якая склалася вакол горада. Гэта пацвярджае сітуацыю, калі на выходных мясцовыя студэнты, літаральна, штурмуюць дызель «Орша-Крычаў». Акрамя гэтага у Горак слабая сувязь як з абласным цэнтрам Магілёвам, гэтак і са сталіцай Мінскам, куды дабрацца можна толькі на аўтобусе і тое толькі пасля шасці (!) гадзінаў дарогі. Пакуль што дадзенае пытанне не змаглі развязаць нават прыватныя перавозчыкі. Важнасць праблемы абумоўленая і тым, што, напрыклад, некаторыя медыцынскія аперацыі ды абследаванні робяцца толькі ў Магілёве.

Свабодны варыянт адказу таксама даў некаторую інфармацыя, хаця яна і не адлюстраваная ў табліцы ды на графіках. Дадатковымі адказамі пра мясцовыя

праблемы сталі: п’янства, кепскае асвятленне і дарогі ў такіх раёнах Горак як Слабада, Хлебазавод, гарадская бальніца; раёны вуліцаў Калініна, Будаўнікоў і Акадэміі маюць вялікую злачыннасць; няма абяцаных мясцовым выканкамам пляцовак для выгулу сабак, нягледзячы на ўведзены адпаведны грашовы збор; ахова здароўя (нязручны графік працы студэнцкай і гарадской паліклінік, недахоп дактароў, няўважлівае стаўленне да пацыентаў); недабудаваная гарадская бальніца; адсутнасць гарадской моладзевай газеты і перадачы на мясцовым радыё, прысвечанай моладзевым праблемам і іншыя.

## Праблемы акадэміі

Другі блок пытанняў быў прысвечаны праблемам Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі **(Малюнак 2)**. Як і ў выпадку з праблемамі горада, сярод названых праблемаў акадэміі таксама вызначыўся 60%-лідэр. Ім стала стаўленне з боку выкладчыкаў да студэнтаў. У гэтую катэгорыю патрапілі такія праблемы як неаб’ек тыўная з пункту гледжання студэнтаў ацэнка іх ведаў, лагоднае стаўленне да тых маладых людзей, якія нейкім чынам (праз бацькоў ці іншых сваякоў) звязаныя з акадэміяй, прыдзірлівыя адносіны да студэнтаў з адрознай грамадска-палітычнай пазіцыяй, чыста прыватныя стасункі паміж выкладчыкамі і студэнтамі, якія, аб’ектыўна, не заўжды складваюцца дадатна і інш.

Другім важным недахопам у акадэмічным навучальным працэсе, адзначаным рэспандэнтамі, з’яўляецца брак (няхватка) метадычнай і навуковай літаратуры. Гэтая праблема была заўважаная 28% апытаных. Насамрэч, такое становішча не з’яўляецца дзіўным нават пры ўмове таго, што бібліятэчныя фонды БДСГА змяшчаюць лічбу кнігаў з шасцю нулямі. Саму праблему можна падзяліць на некалькі падпраблемаў: 1) існуе шэраг падручнікаў, якія маральна састарэлі і не прыдатныя для карыстання; 2) некаторых падручнікаў ці навучальных дапаможнікаў не хапае на ўсіх ахвочых (часта кнігі ёсць у тых, хто першы прыйшоў у бібліятэку); 3) па некаторых дысцыплінах увогуле не існуе прыдатных для засваення матэрыялу кніг. Такімі, кажучы эканамічнай мовай, «вузкімі месцамі» на думку рэспандэнтаў з’яўляюцца кнігі па філасофіі, замежных мовах, «Біржавой справе», «Справаводству», «Асновах навуковых доследаў», «Абароне насельніцтва» і інш.

Толькі 22% моладзі ў той ці іншай ступені сутыкнуліся з хабарніцтвам у акадэміі і мяркуюць, што гэтая праблема сапраўды з’яўляецца важнай.

У свабодным варыянце адказу апытаныя звярнулі сваю ўвагу на такія праблемы як: платныя адпрацоўкі прапушчаных семінарскіх і лабараторных заняткаў, нестабільнасць умоваў ацэнкі ведаў (адбыўся пераход да блочна-модульнай сістэмы, але некаторыя выкладчыкі мяняюць «правілы гульні» на свой погляд) і ў вялікай ступені – прымусовае размеркаванне.

## Побытавыя праблемы

Чарговы блок апытання быў прысвечаны праблемам, якія сустракаюцца па месцы жыхарства рэспандэнтаў **(Малюнак 3)**. У сувязі са спецыфікай (асноўнай часткай апытаных былі студэнты) галоўныя адказы тычыліся стану інтэрнатаў БДСГА. Нягледзячы на наяўнасць паказальных інтэрнатаў такіх як, напрыклад, 10 і 12, большасць апытаных указваюць на крытычны стан санітарна-гігіенічных умоваў месцаў жыхарства студэнтаў. Так, амаль 57% рэспандэнтаў незадаволеныя станам кухняў, душаў, прыбіральняў. У сваіх каментарах рэспандэнты акцэнтавалі ўвагу на адсутнасці штодзённай падачы гарачай вады, а таксама сцвярджалі, што ў інтэрнатах могуць не даваць гарачай вады, нават калі яе даюць па ўсім горадзе.

Цесна стан інтэрнатаў звязаны з рамонтам памяшканняў. Гэта адзначылі 44% апытаных, якія заўважылі, што ў большыні выпадкаў рамонты праводзяцца альбо нерэгулярна, альбо даўно не праводзіліся. Да гэтага далучыліся не толькі жыхары інтэрнатаў, але і шматкватэрных дамоў Горак. Яны звярнулі ўвагу на кепскі стан пад’ездаў, сістэмы ацяплення, а таксама сістэмы падачы гарачай і халоднай вады.

28% апытаных адзначылі за галоўную праблему зімовае ацяпленне памяшканняў, прычым гэтая праблема ў большай ступені адносілася да той часткі апытаных, якія не жывуць у інтэрнатах акадэміі. Дадзенае становішча з’яўляецца асабліва важным, калі ўлічыць рост аплаты за камунальныя паслугі. Мінулай зімой такі разрыў паміж аказанымі паслугамі і іх коштам прывёў да пэўнай сацыяльнай напружанасці ў асобных частках гораду, асабліва ў шматкватэрных дамах старой пабудовы. Гэта выявілася ў шматлікіх зваротах гараджанаў ва ўладныя органы, а таксама ў сродкі масавай інфармацыі.

Найменшай увагі рэспандэнтаў заслугоўвала праблема з адсутнасцю начнога асвятлення на шэрагу вуліцаў Горак, аднак пры гэтым яна атрымала 14% галасоў. Такімі «цёмнымі» раёнамі на думку апытаных з’яляюцца Слабада, Вучгас, завулак Фрунзе, ускрайкі горада.

Свабодны адказ выявіў такія праблемы: недахоп месцаў у студэнцкіх інтэрнатах, што прыводзіць да засялення вялікай колькасці жыхароў у адзін пакой (да 7 чалавек); засяленне студэнтаў-замежнікаў у пакоі з лепшымі ўмовамі пражывання; увядзенне «карантыну», падчас якога наведванне інтэрнатаў жыхароў студэнцкіх інтэрнатаў забараняецца; часавыя абмежаванні на ўваход і выхад з інтэрнатаў (вярнуцца ў інтэрнат неабходна да пэўнай усталяванай гадзіны, за невыкананне існуе адказнасць) і інш.

## Вырашэнні

Апошні блок апытання быў прысвечаны прапановам па вырашэнні праблемаў, указаных рэспандэнтамі **(Малюнак 4)**. Найбольш прыхільнікаў (29%) атрымаў варыянт «уласная праца па вырашэнні праблемаў». Сюды ўвайшлі такія адказы як правесці рамонт у пакоях і ў пад’ездах дамоў уласнымі сіламі, сабраць грошы на лямпачкі на тыя паверхі, дзе не гарыць святло, арганізаваць больш адказны графік прыборкі кухняў у інтэрнатах, пра водзіць арганізаваныя «суботнікі» ў дварах і на вуліцах, збіраць людзей на ліквідацыю несанкцыянаваных звалак і інш. Трэба дадаткова адзначыць, што такая сітуацыя, калі больш спадзяюцца на ўласныя сілы, чым на дапамогу збоку, агульная ў сённяшнім беларускім грамадстве. Людзі паступова пачынаюць звыкацца з тым, што выратаванне тапельца становіцца выключна яго асабістай справай.

Чвэрць рэспандэнтаў аддалі пароўну перавагу двум іншым варыянтам вырашэння праблемаў: зварот у мясцовы Савет дэпутатаў, а таксама дзейнасць у межах грамадскіх арганізацыяў. Трэба заўважыць, што ў адрозненні ад больш сталага пакалення моладзь лічыць мясцовыя прадстаўнічыя органы вартымі таго, каб паспрабаваць праз іх нечага дамагацца. Рэспандэнты заявілі пра неабходнасць звяртацца да дэпутатаў, каб тыя карысталіся са свайго статусу і дамагаліся вырашэння лакальных праблемаў.

Прыемным момантам з’яўляецца і тое, што маладыя людзі гатовыя аб’ядноўвацца ў межах грамадскіх арганізацыяў ці ініцыятываў і спрабаваць вырашаць праблемы праз гэтыя структуры. Аднак неабходна заўважыць, што вялікая частка апытаных пад такімі структурамі, перадусім, разумела студэнцкі прафсаюзны камітэт і адыёзную арганізацыю БРСМ. Згодна з дадатковай інфармацыяй апытання каля 15%

рэспандэнтаў гатовыя для вырашэння вызначаных вышэй праблемаў звярнуцца да рэсурсаў і ўплыву менавіта гэтых арганізацыяў.

Кожны пяты апытаны прапанаваў і іншы сродак вырашэння праблемаў. Ім сталася арганізацыя тэрытарыяльнага самакіравання. Яму аддалі перавагу тыя, хто сутыкаўся з працай жыллёвых камітэтаў у кааператыўных дамах. На погляд такіх рэспандэнтаў падобная самаарганізацыя на месцах магла б дазволіць вырашыць такія праблемы як: начное асвятленне, рамонт пад’ездаў і дамоў, прывядзенне ў парадак ацяпляльных сістэмаў і сістэмаў падачы гарачай ды халоднай вады і іншае. Таксама жыхары студэнцкіх інтэрнатаў звярталі ўвагу на недастаткова эфектыўную працу іх Студэнцкіх саветаў, якія, фактычна, ператварыліся ў «карныя органы адміністрацыі» (назіраюць за парадкам, правяраюць чысціню пакояў і інш., але нічога не робяць, каб звярнуць увагу кіраўніцтва на побытавыя праблемы моладзі).

Самым дзіўным вынікам апытання сталася тое, што найбольш вядомы і найбольш карыстаны шлях барацьбы з праблемамі – збор подпісаў – спадабаўся як сродак вырашэння толькі 17% рэспандэнтаў. На наш погляд такі вынік апытання звязаны з адсутнасцю пазітыўных прыкладаў вырашэння праблемаў шляхам збору подпісаў. Напрыклад, у БДСГА пасля ўвядзення вядомых платных адпрацовак заняткаў на эканамічным факультэце было сабрана некалькі сотняў подпісаў студэнтаў і перададзена ў дэканат факультэту. Аднак гэты крок не выклікаў ніякай рэакцыі з боку адміністрацыі.

Таксама вялікім мінусам сталася і праведзеная, у тым ліку на тэрыторыі Горак, кампанія дэпутата Палаты прадстаўнікоў Навасяда па ўнясенні зменаў у Палажэнне «Аб прымусовым размеркаванні выпускнікоў». Мясцовыя прыхільнікі дэпутата займаліся зборам подпісаў, якія павінны былі стаць аргументам у справе адмены прымусовага размеркавання маладых спецыялістаў па неперспектыўных прадпрыемствах і заражаных пасля аварыі на ЧАЭС мясцінах. Подпісы былі сабраныя, але зваротнай інфармацыі, а тым больш адмены размеркавання, мясцовыя маладзёны так і не дачакаліся.

І ўсё ж найменшую колькасць адказаў рэспандэнтаў атрымаў варыянт вулічнага змагання з праблемамі. Толькі 11% маладых жыхароў Горак мяркуюць, што праблема можа быць вырашана, калі прыцягнуць да яе ўвагу грамадства падчас вулічных акцыяў. Імі могуць быць пікеты, хэпінінгі, флэш-мобы і інш. Таксама сюды рэспандэнты адносілі раздачу на вуліцы друкаваных матэрыялаў (самвыдату, газет, улётак), прысвечаных пэўным праблемам.

Дадатковымі прапановамі моладзі сталі звароты ў сродкі масавай інфармацыі (у мясцовыя газеты, на радыё, на «гарачыя лініі») і звароты да палітыкаў падчас іх выбарчых кампаніяў.

Увогуле вынікі блоку яшчэ раз пацвердзілі, што ўбачыць праблему прасцей, чым указаць нават з прапанаваных варыянтаў найлепшы для яе сродак рашэння. Таксама вынікі могуць сведчыць пра пэўны песімізм апытаных адносна рашэння іх уласных праблемаў, менавіта таму маладзёны разгубіліся ў варыянтах і не аддалі ніводнаму з іх аднадушнай уласнай падтрымкі.

Такім чынам праведзенае апытанне дазволіла не толькі выявіць найбольш важныя праблемы горада, акадэміі і ўмоваў пражывання моладзі, але і акрэсліць шляхі іх вырашэння, галоўным з якіх стала жаданне маладых людзей горада ўласнымі сіламі і працай уплываць на мясцовую сітуацыю.

**Табліца 3.**

# Вынікі моладзевага апытання па мясцовых праблемах

| | | |
|---|---|---|
| **1. Якія, на Вашу думку, праблемы з'яўляюцца найбольш важнымі для нашага горада:** | | |
| Праца гарадскога транспарту | 153 | 15% |
| Недахоп месцаў адпачынку | 598 | 60% |
| Нязручны расклад міжгародніх аўтобусаў | 209 | 21% |
| Нязручны расклад міжгародніх цягнікоў | 223 | 22% |
| **2. Якія, на Вашу думку, праблемы з'яўляюцца найбольш важнымі для БДСГА:** | | |
| Хабарніцтва | 223 | 22% |
| Адносіны з боку выкладчыкаў, адміністрацыі | 612 | 61% |
| Недахоп метадычнай і навуковай літаратуры | 278 | 28% |
| **3. Якія, на Вашу думку, праблемы з'яўляюцца найбольш важнымі для вашага месца жыхарства (інтэрната, дома, пад'езда, двара):** | | |
| Санітарна-гігіенічныя ўмовы (душы, прыбіральні, кухні) | 571 | 57% |
| Ацяпленне | 278 | 28% |
| Адсутнасць рамонту | 445 | 44% |
| Адсутнасць начнога асвятлення | 139 | 14% |
| **4. Адзначце, калі ласка, найбольш верагодныя на Вашу думку магчымасці вырашэння ўказаных Вамі праблем:** | | |
| Уласная праца па вырашэнні праблемы | 292 | 29% |
| Збор подпісаў | 167 | 17% |
| Зварот у мясцовы Савет дэпутатаў | 251 | 25% |
| Арганізацыя тэрытарыяльнага самакіравання | 209 | 21% |
| Дзейнасць у межах няўрадавых арганізацый | 251 | 25% |
| Арганізацыя вулічных акцый з мэтай прыцягнення ўвагі да канкрэтнай праблемы | 111 | 11% |
| **Разам:** | **1002** | **100%** |




**Малюнак 1. Вынікі апытання: праблемы гораду**




**Малюнак 2. Вынікі апытання: праблемы акадэміі**




**Малюнак 3. Вынікі апытання: побытавыя праблемы**




**Малюнак 4. Вынікі апытання: прапанаваныя вырашэнні праблемаў**

## Вырашэнне праблемаў: свежыя ідэі

Зразумела, што вызначыць праблемы – нялёгкая задача, але знайсці для іх эфектыўныя шляхі вырашэння – задача ўдвая цяжэйшая. Прапануем вам ніжэй азнаёміцца з некаторымі ідэямі, якія выказала Горацкая моладзь падчас абмеркавання мясцовых праблемаў.

### Недахоп месцаў адпачынку

Гэтая праблема наўрад ці з'яўляецца для каго-небудзь невядомай. Тое, што інфраструктура адпачынку ў такім маладзёвым горадзе, як наш, зусім слабенькая – відавочна. Менавіта таму, на думку часткі моладзі, гэты брак можна быць кампенсаваны праз адкрыццё ў Горках: спорт-бару; рок-клубу (ці нават шэрагу розных клубаў, арыентаваных на розныя музычныя стылі); пляцоўкі для вулічных спеваў (а то пачынаеш спяваць, а цябе забірае міліцыя); таталізатару.

Іншым накірункам можа стаць адмысловая рэгіянальная праграма па падтрымцы таленавітай моладзі. Гэтая праграма магла б уключыць вечарыны і конкурсы мясцовых маладых паэтаў, музыкаў і спевакоў. Добрай падтрымкай магла б стаць арганізацыя перыядычных канцэртаў маладых гуртоў і выканаўцаў як з Горак і Горацкага раёну, гэтак і з іншых гарадоў. Выдатным для маладых выканаўцаў стымулам маглі б стаць мясцовыя выступы разам са знакамітымі агульнабеларускімі творцамі.

Выхаваўчы і культурны эфект мелі б візіты народных пісьменнікаў Беларусі ў Горкі, сустрэчы творцаў са школьнікамі і студэнтамі. Таксама цікавымі былі б выставы беларускіх жывапісцаў і інш.

Для гэтых мэтаў, на думку моладзі, неабходныя мясцовыя ці вонкавыя інвестыцыі, а таксама зацікаўленасць уладаў. Іншым шляхам можа стаць выкарыстанне існых зонаў адпачынку пры трансфармацыі іх у цікавыя і папулярныя сярод моладзі месцы. У гэтым разе неабходна адпаведнае стаўленне грамадства для змянення гэтых месцаў адпачынку на маладзёвы манер. Гэтага можна дасягнуць праз тэматычныя матэрыялы ў мясцовай прэсе, распрацоўку адмысловых бізнес-планаў, зварот да ўплывовых у рэгіёне асобаў.

### Сацыяльныя праблемы

Да сацыяльных праблемаў аднесены вялікі блок, які ахоплівае дрэнны стан сантэхнікі, побытавыя праблемы жыхароў інтэрнатаў, стан кухняў, душаў і прыбіральняў, а таксама кепскае асвятленне акраінаў горада. Асабліва балюча ўспрымаецца студэнтамі адсутнасць штодзённай падачы гарачай вады. Гэтую частку праблемаў прапанавана вырашаць вясёлымі акцыямі з мэтай прыцягнення ўвагі ўладаў і грамадскасці.

Напрыклад, правесці дыскатэку ў інтэрнаце, дзе не даюць гарачую ваду, і лепшай пары падарыць вядро кіпню. Таксама можна зрабіць апытанне моладзі з нагоды сацыяльных праблемаў і падарыць яго, напрыклад, «Региональным ведомостям». Гэта стане пэўным стымулам для тых службаў, ад якіх залежыць вырашэнне дадзеных праблемаў.

Па сацыяльных праблемах проста арганізоўваць збор подпісаў ці нават падаваць скаргі ў суд (асабліва, калі праз адсутнасць асвятлення было здзейснена злачынства, быў зламаны ваш ровар ці былі моцна пашкоджаны новыя бацінкі ад Prada).

Можна весела правесці збор грошай на пакупку лямпачак ці расклейваць сцікеры з надпісам «Вады...» у час, калі ва ўсім горадзе гарачая вада ёсць, а ў інтэрнатах няма.

Можна выйсці на дарогі, дзе няма асвятлення, са свечкамі ці правесці рок-канцэрт «Цемра за святло», «Панкі за ваду».

Таксама можна напісаць у «Кнігу скаргаў і прапановаў», якая зараз ёсць па ўсіх службах і прадпрыемствах ці звярнуцца ў Савет дэпутатаў.

Нарадзілася ідэя плакацікаў з выявай чалавечка, які то ходзіць нямытым, бо не даюць ваду, то ламае ногі, рукі, бо і дарогі кепскія і асвятлення няма. Карацей, і слоган да гэтага ўсяго: «Цёплай вады. Роўных дарог. Светлых раёнаў».

## СМІ

Як было сказана ў папярэднім раздзеле, па выніках праведзенага апытання вялікая частка рэспандэнтаў звярнула ўвагу на неабходнасць стварэння ў Горках моладзевых сродкаў масавай інфармацыі. Гэтая праблема, на думку апытаных, узнікае ў сувязі з супярэчнасцю паміж колькасцю маладога насельніцтва ў нашым горадзе і тымі СМІ, якія абслугоўваюць гэтую катэгорыю жыхароў.

У горадзе выдаецца толькі адна зарэгістраваная газета, якая ў той ці іншай ступені працуе для моладзі – шматтыражка БДСГА «Советский студент». Аднак гэтая газета ў асноўным надае ўвагу праблемам навучальнага і выхаваўчага працэсу ў самой акадэміі і апісвае апошнія падзеі з жыцця ВНУ.

Пэўную маладзёвую інфармацыйную прастору стварае Інтэрнэт-рэсурс студэнтаў і выпускнікоў спецыяльнасці «Міжнародныя эканамічныя зносіны» БДСГА. Старонка размяшчаецца па адрасе http://gorki-meo.org і змяшчае інфармацыю са студэнцкага жыцця, сусветныя моладзевыя навіны, спасылкі на навуковыя рэсурсы, мясцовы гумар.

Каб вырашыць праблему з інфармацыяй для моладзі, на думку саміх маладых людзей, неабходна запусціць агульнагарадскі моладзевы сайт, праз які можна было б абмяркоўваць лакальныя праблемы, заводзіць новых сяброў, знаёміцца з гісторыяй горада і апошнімі гарачымі навінамі.

Таксама магчыма ажыццявіць задумку, якая ўжо аднойчы гучала па раённым радыё – стварэнне маладзёвага эфіру. Ён мог быць рэалізаваны ў выглядзе альбо перадачы пра жыццё горацкай моладзі альбо ў выглядзе блока навінаў, прысвечанага мясцовым маладым людзям.

Акрамя гэтага цікавай ідэяй з'яўляецца стварэнне сеткавага радыё ў БДСГА, якое б магло вяшчаць на калідорах акадэміі падчас перапынкаў. Такое моладзевае радыё магло б не толькі інфармаваць моладзь, але і забаўляць – «круціць» апошнія музычныя хіты, перадаваць віншаванні.

Таксама адным са шляхоў вырашэння дадзенай праблемы магло б стаць стварэнне моладзевых рубрык ці старонак у мясцовай прэсе: газетах «Ленінскі шлях» і «Региональные ведомости».

## Ахова здароўя

Гэтая праблема кранае таксама і такую маладую і адносна здаровую ў фізічным сэнсе групу насельніцтва як студэнты. Асноўная ўвага ў дадзенай праблеме надаецца: 1) нязручнаму графіку працы студэнцкай і гарадской паліклінік (шэраг дактароў працуюць падчас заняткаў у акадэміі, таму, каб патрапіць на прыём, неабходна прапускаць заняткі); 2) недахопу дактароў (шмат да каго стаяць вялікія чэргі); 3) часам няўважлівае стаўленне да пацыентаў з боку некаторых медыкаў.

Змяніць становішча ў дадзенай сферы, на думку моладзі, можа кампанія ў СМІ, падчас якой самі дактары маглі б падняць названыя праблемы і звярнуць увагу ўладаў на недахопы, якія існуюць у ахове здароўя на лакальным узроўні.

Таксама могуць дапамагчы тэматычныя ўлёткі, збор подпісаў пад петыцыямі, распрацоўка альтэрнатыўнага зручнага пацыентам графіку працы некаторых дактароў.

Была прапанавана і вясёлая акцыя. Двое маладых людзей каля кабінету якога-небудзь доктара, якога цяжка знайсці на сваім рабочым месцы, прапаноўваюць наведнікам уцягнуць іголку ў нітку. «Гэта таксама цяжка зрабіць, як патрапіць на прыём да гэтага доктара», – распавядаюць прысутным маладзёны і раздаюць тэматычныя матэрыялы.

Але без актыўнай пазіцыі самога медыцынскага персаналу не магчыма дасягнуць поспеху пры вырашэнні дадзенай праблемы. Таму на недахоп сродкаў, якія выдаткоўваюцца на ахову здароўя ў нашым рэгіёне, павінны звяртаць увагу мясцовых уладаў менавіта самі дактары. Гэта тычыцца і недабудаванай бальніцы, якая ўжо шмат гадоў «мазоліць» вочы ўсяму горада.